# *ФАЛЬКЛОР ПАЛЬМІНШЧЫНЫ Ў СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ*

Репозиторий ВГУ

2009

УДК 398 (476.5)
ББК 82.3 (4 Беи)
Ф 19

*Складальнік:* дацэнт кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, кандыдат філалагічных навук ***А.С.Емяльянаў***

*Рэцэнзент:* загадчык кафедры літаратуры УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт ***В.М.Паклонская***

Репозиторий ВГУ

Дадзенае выданне з’яўляецца першай асобнай публікацыяй фальклорных твораў розных жанраў Пальміншчыны, запісаных у час фальклорна-краязнаўчай практыкі. Тэксты сістэматызаваны па жанравых адзнаках і забяспечаны невялікімі ўступнымі артыкуламі.

Адрасуецца студэнтам-філолагам, філолагам, фальккларыстам, настаўнікам школ, вучням і ўсім, хто цікавіцца народнай паэтычнай творчасцю.

**УДК 398 (476.5)**
**ББК 82.3 (4 Беи)**

© УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2009

# Прадмова

Пальміншчына – гэта вёскі Баталі, Бароўцы, Евіна, Кабішча, Латыгава, Пальмінка, Раманава, Сюбараўка, Шпакава, Шпакі, Хабаты, Хартова Пальмінскага сельсавета Гарадоцкага раёна Віцебшчыны, у якіх збіралі матэрыялы беларускай народнай паэтычнай творчасці ў час фальклорна-краязнаўчай практыкі 2007 года студэнты факультэта беларускай філалогіі ВДУ імя П.М.Машэрава А.Баканаў, А.Глябовіч, М.Злотнікава, А.Мартынава, В.Матора, Д.Рубіс, Ю.Самсонаў, А.Сталярэнка, В.Шавяка, Н.Яскевіч.

Абраны куточак Гарадоччыны вядомы тым, што на яго тэрыторыі знаходзяцца: вёска Баталі, назву якой звязваюць з падзеямі вайны 1812 года; вёскі Пальмінка і Кабішча, першыя ўпамінанні пра якія адносяцца да пачатку XVI стагоддзя; Свята-Узнясенская царква ў в. Кабішча, пабудаваная на месцы старажытнага капішча; вайсковыя пахаванні ў в.Евіна і в.Кабішча; помнік на магіле ахвярам фашызму ў в.Хартова, дзе былі спалены 265 мірных жыхароў; Хартоўскі вялікі камень вышынёй 2 м., акружнасцю 15,4 м., які мае форму галавы барана.

Наша цікавасць да абранага рэгіёну выклікана тым, што ў шматтомным акадэмічным выданні Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН РБ цалкам адсутнічаюць публікацыі твораў народнай паэтычнай творчасці з Пальміншчыны, хаця на Гарадоччыне ў свой час збіралі фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы М.Я.Нікіфароўскі, Е.Р.Раманаў, А.М.Семянтоўскі, П.В.Шэйн, А.Р.Пшчолка, А.А.Шлюбскі, Г.А.Барташэвіч, А.С.Фядосік, І.К.Цішчанка і інш. Каб кампенсаваць гэты недахоп, удзельнікамі экспедыцыі праведзена планамернае суцэльнае фалькларыстычнае абследаванне ўсёй тэрыторыі Пальмінскага сельсавета.

Вялікую групу ў сучасным паэтычным рэпертуары Пальміншчыны складаюць каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, лірычныя песні, прыпеўкі, з празаічных – легенды і паданні, а з малых жанраў – прыказкі і прымаўкі, загадкі, большасць якіх уваходзяць у духоўную культуру насельнікаў гэтага краю як спадчына мінулага і захоўваюцца ў памяці людзей старэйшага пакалення. Творы народнай паэзіі названых жанраў мы прапануем усім, хто цікавіцца сучасным станам беларускага фальклору.

А.С.Емяльянаў

***

Складальнікі выказваюць падзяку вучням і настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Пальмінскай школы Стахавец І. за фальклорныя матэрыялы, прадстаўленыя ў наша распараджэнне; Міхайлоўскай А.В. і Кукушкінай К.С., якія ажыццявілі камп’ютэрны набор зборніка.

Рэпозиторий ВГУ

# Паэзія земляробчага календара

Каляндарна-абрадавая паэзія суправаджала аграрныя святы і працу селяніна на працягу гаспадарчага года. Улічваючы спецыфіку гаспадарчых работ, яна дзеліцца на чатыры цыклы: зімовы, веснавы, летні і асенні. Адной з прычын яе ўзнікнення была залежнасць чалавека ад прыроды, якая прымушала людзей абагаўляць і адушаўляць яе, шукаць яе заступніцтва і дапамогі. Гэта найбольш старажытны пласт народнай культуры, у якім захаваліся рэшткі анімізму (веры ў існаванне душ і духаў), антрапамарфізму (надзяленне чалавечымі якасцямі з'яў прыроды, жывёлаў, прадметаў), магізму (веры ў здольнасць чалавека ўздзейнічаць на навакольны свет і нават багоў). Мэтамі абрадаў і паэтычных твораў было ўздзеянне на навакольны свет, сонца, ваду, зямлю, сілы прыроды, выкліканае імкненнем засцерагчы чалавека і хатнюю жывёлу ад хваробы, ад неўрадлівасці збажыны, забяспечыць дастатак і шчаслівае жыццё.

## *Калядкі*

Калядныя песні – жанр зімовага цыкла. Яны на Віцебшчыне выконваліся гуртам калядоўшчыкаў у ноч перад Нараджэннем Хрыстовым ці ў першы дзень свята і працягваліся да Новага года або да Вадохрышча. Калядоўшчыкі хадзілі з зоркай, вадзілі "казу" (добры дух поля, апякун ураджаю). Каляднымі песнямі віншавалі, праслаўлялі гаспадара, гаспадыню, іх дзетак, жадалі шчасця і здароўя, добрага ўраджаю, ідэалізавана малявалі сялянскую хату, гаспадарку, жадаемае выдавалі за рэальнае. Яны належаць да найбольш старажытных фальклорных жанраў.

### А калядачкі, хутчэй, хутчэй

А калядачкі, хутчэй, хутчэй,
А нам саліпаўка надакучыла,
Усе жывоцікі перамучыла.
Мы з жымеры зубы праелі,
А каб калядак нядзель дзесятак,
А піліпаўкі хоць адзін дзянёчак
І то, каб адзін святы вечарочак.

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

### А на калядачкі

А на калядачкі
Даюць сала, кілбасачкі,
Каляда.



Репозиторий ВГУ

Калядоўшчыкі ходзяць,
Казу Машку водзяць,
Каляда.

Песенькі спяваюць,
Дабра ўсім жадаюць,
Каляда.
Зап. Баканаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леднік Н.І., 71 г.

**Ой, каляднічкі, не абмінайце**

Ой, каляднічкі, не абмінайце,
Каляда.
У маёй хатаньцы пабывайце,
Каляда.
Свае песенькі спявайце,
Каляда.
Долі, шчасцейка пажадайце,
Каляда.
Я вячэру для вас гатую,
Каляда.
Усіх вас хораша пачастую,
Каляда.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна ад Шпілёй Е.Я., 75 г.

**Го-го-го, каза, го-го-го, шэра**

– Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,
Дзе рожкі дзела?
– На соль праела.
Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,
Лезь, каза, на печ,
Пакажы хвасцец.
Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,
Кладзіся, каза, на пол,
Пакажы хахол.
Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,
На печы авёс
Вялікі падрос.
Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,
На палу жыта
Нагамі збіта.
Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,



Репозиторий ВГУ

А ў тым жыце
Птушкам добра жыці.
Го-го-го, каза, го-го-го, шэра.

Зап. Мартынава А. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Селіванавай М.А, 72 г.

## *Масленічныя песні*

На мяжы зімовага і веснавога цыклаў, у апошні тыдзень Мясаеда, у час гульняў моладзі, катання на санках з гор, па крузе, гушкання на арэлях, спальвання чучала зімы, калі вакол вогнішча вадзілі карагоды, спяваліся масленічныя песні. Абрадамі і песнямі старажытнага свята сустрэчы вясны – Масленіцы – людзі ўшаноўвалі сонца, услаўлялі абрадавую сытнасць, што, на іх думку, павінна было паскорыць абуджэнне прыроды, магічна садзейнічаць ураджаю і дастатку ў кожнай сям'і.

### **А мы масленку дажыдалі**

1

А мы масленку дажыдалі,
Дажыдалі,
Ой, дажыдалі.

У аконца паглядалі,
Паглядалі,
Ой, паглядалі.

Яе песнямі віталі,
Віталі,
Ой, віталі.

Усіх блінамі частавалі,
Частавалі,
Ой, частавалі.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в. Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачова І.П., 59 г.

### **А мы масленку сустракалі**

А мы масленку сустракалі,
Сустракалі,
Ой, сустракалі.

Сырам гору набівалі,
Набівалі,



Репозиторий ВГУ

Ой, набівалі.

Маслам гору палівалі,
Палівалі,
Ой, палівалі.

Дзяўчат сырам частавалі,
Частавалі,
Ой, частавалі.

Мальцы гору аблізалі,
Аблізалі,
Ой, аблізалі.

Нас на саначках каталі,
Каталі,
Ой, каталі.

Наша масленка катліва,
Катліва,
Ой, катліва.

Наша масленка сытліва,
Сытліва,
Ой, сытліва.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в. Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачова І.П., 59 г.

**А мы масленку праважалі**

А мы масленку праважалі,
Праважалі,
Ой, праважалі.

Блінамі, сырам частавалі,
Частавалі,
Ой, частавалі.

Не будзь ты, масленка, сем дзянёчак,
Сем дзянёчак,
Ой, сем дзянёчак.

А будзь ты, масленка, гадочак,
Гадочак,
Ой, гадочак.



Репозиторий ВГУ

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в. Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачова І.П., 59 г.

# ***Веснавыя песні***

Важнейшымі аграрнымі веснавымі святамі былі Вялікдзень, Юр’е, Сёмуха, у час якіх спявалі вяснянкі, валачобныя песні, юраўскія, талочныя і г.д. Веснавы перыяд земляробчага календара пачынаўся з 1 сакавіка гуканнем вясны. Песнямі-вяснянкамі, якія даносіліся з узвышшаў, з гуменных стрэх, ад вогнішчаў, дзяўчаты заклікалі вясну, імкнуліся замкнуць, прагнаць халодную зіму з лютымі маразамі, доўгімі начамі, забяспечыць хутчэйшы прылёт птушак, якія прынясуць на сваіх крылах цяпло.

**Прыйдзі, прыйдзі, вясна**

Прыйдзі, прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, красна.
Замкні зімачку сцюдзёную,
Адамкні лецечка цёплае.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Хадарэнка Н.В., 58 г.

**Хутчэй, птушачкі, прыляціце**

Хутчэй, птушачкі, прыляціце,
Лета цёплае прынясіце.
А нам зімачка надаела,
Увесь хлебушак пераела.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Хадарэнка Н.В., 58 г.

**Хутчэй, птушачкі, прыляціце**

Хутчэй, птушачкі, прыляціце,
Лета цёплае прынясіце.
А нам зімачка надакучыла,
Жываточкі перамучыла.
Зап. Мартынава А. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Селіванавай М.А., 72 г.

**А ты, вясна, ты красна**

– А ты, вясна, ты, красна,
А што ж ты нам прынясла,
А што ж ты нам прынясла?
– З пунькі саломку вытрасла,



Репозиторий ВГУ

З пунькі саломку вытрасла,
З клеці жыта вынесла.
– А ты, вясна, ты, красна,
А што ж ты нам прынясла,
А што ж ты нам прынясла?
– Старым бабкам – па кіёчку,
Старым бабкам – па кіёчку,
Маладым жонкам – па сыночку.
– А ты, вясна, ты, красна,
А што ж ты нам прынясла,
А што ж ты нам прынясла?
– А мальчыкам – па канёчку,
А мальчыкам – па канёчку,
А дзевачкам – па вяночку.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

**Пойдзем, жаночкі**

Пойдзем, жаночкі,
У лугі, лужочкі
Завіваць вяночкі
На жыта густое,
На ячмень каласісты,
На авёс расісты.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Раманава Гарадоцкага раёна ад Воранавай А., 62 г.

## *Валачобныя песні*

Найбольш багаты раздзел беларускай каляндарнай паэзіі складаюць валачобныя песні, якія спяваў валачобны гурт (пачынальнік, падхватнічкі, механоша) увечары першага ці другога дня Вялікадня, вандруючы па вёсцы ад хаты да хаты. У валачобных песнях паказана праца земляроба, узвялічаны гаспадар і ўся яго сям’я, услаўлены жытні палетак, гаспадарка, хатні быт, выказаны пажаданні хуткага вяселля нежанатым хлопцам і дзяўчатам. Валачобныя песні маюць характэрныя прыпевы: “Хрыстос васкрэс, Сын Божы!”, “Ай, сад зялёны, вішнёвы!”, “Вясна красна на ўвесь свет!”, “Зялён явар, кудравы!” і г.д. Адметнай рысай паэтыкі валачобных песень з’яўляецца гіпербала. Валачобныя песні – нацыянальны здабытак беларускага народа.

**У нядзельку кветную**

У нядзельку кветную,
Хрыстос васкрос!*



Репозиторий ВГУ

Дайце два яечкі мне,
Хрыстос васкрос!
У нядзелю кветную,
Хрыстос васкрос!
Зап. Злотнікава М. С. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна
ад Перавалавай Т.М., 82 г.

**Валачобнікі валачыліся**

Валачобнікі валачыліся,
Вясна красна на ўвесь свет!*
Валачыліся, намачыліся,
Ля кожнай хатанькі пастаялі,
Шчаснай долечкі пажадалі.
Ля кожнай хатанькі пастаялі,
Падаруначкаў чакалі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
Зап. Злотнікава М. С. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна
ад Перавалавай Т.М., 82 г.

## *Купальскія песні*

Купалле – найвялікшае і найпрыгажэйшае свята еднасці чалавека працы з прыродай, якое адзначалі ў ноч на 24 чэрвеня (ст.ст.) і прымяркоўвалі да летняга сонцазвароту. Гэта была кульмінацыя лета, час найвышэйшага росквіту прыроды. Купалле – адно з галоўнейшых святаў з часоў язычніцтва, калі выконвалі і выконваюць сёння ачышчальныя абрады (купанне ў вадзе, скаканне праз вогнішчы, гушканне на арэлях). Купальскаму святу прысвячалася вялікая колькасць легендаў, паданняў, песень. Купальскія песні спявалі ў час збору лекавых траў, карэнняў, кветак, каб павялічыць іх лекавую сілу, пры выправе моладзі на абранае для святкаванне месца, ля купальскага вогнішча. У купальскіх песнях ярка адбіліся клопаты селяніна аб ураджаі і захаванні жывёлы. Пашыранымі былі песні, прысвечаныя маладой дзяўчыне, Купалачцы, на тэму кахання і шлюбу.

**Як на Йвана на Купала**

Як на Йвана на Купала
Купаліся дзве сястрыцы,
Купаліся, гаварылі:
– Што такое за дзіўное:
Умесце раслі, розна зайшлі.
Як на Йвана на Купала
Купаліся дзве нявесткі,



Репозиторий ВГУ

Купаліся, гаварылі:
– Што такое за дзіўное:
Розна раслі, за братоў зайшлі.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Пойдзем, дзеўкі, каля жыта**

Пойдзем, дзеўкі, каля жыта,
Ці не знойдзем каго ў жыце:
Ці коніка варанога,
Ці мальчыка маладога.
На коніку ездзіць будзем,
А з мальчыкам гуляць будзем.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Купальная ночка маленька**

Купальная ночка маленька.
– Купалінка, цёмная ночка,
Дзе твая дочка?
– Мая дочка ў садочку
Рвець цвяточкі.
Цвяточкі рвець, вяночкі ўець.
Большым дзеўкам – па вяночку,
Малым дзеўкам – па цвяточку.
Большыя дзеўкі замуж пойдуць,
Малыя дзеўкі гуляць пойдуць.
Запісаў Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Селіванавай В.К.

**Купала, Купала**

– Купала, Купала,
Дзе ты пабывала?
– На рынку я бывала,
Таргі таргавала,
Таргі таргавала,
Мамку я купляла.
Мамку я купляла,
Свякроў прадавала.
Свякроў – за капейку,
А мамцы – цаны нету.
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Обадавай Л.С.

Репозиторий ВГУ

## *Жніўныя песні*

Жніўныя песні – частка летняга цыкла каляндарна-земляробчага фальклору. Падзяляюцца на зажынкавыя (іх вельмі мала), уласна жніўныя і дажынкавыя. У песнях жніва гучаць клопат аб тым, каб жніву паспрыяла добрае надвор’е, радасць з выпадку дажынак, скарга на непасільную працу, нялёгкае жыццё ў сям’і мужа, шкадаванне пра страчаную дзявочую прыгажосць; нараканні на сонца, якое “раненька ўсходзіць і позненька заходзіць”; на пана і прыганятага, якія “скуру могуць зняць”; праходзіць тэма радасці з выпадку заканчэння жніва. Высокую ацэнку паэзіі беларускага жніва даў вядомы даследчык А.С.Ліс: “Сацыяльная значнасць зместу жніўнай песнятворчасці, псіхалагічна даставерныя вобразы жанчыны-рабачайкі, жняі, высокі агульны эстэтычны ўзровень паэтычных тэкстаў забяспечылі беларускай жніўнай песні высокае месца ў іерархіі этнічных духоўных каштоўнасцей”. Выканаўцамі жніўных песень былі пераважна жанчыны.

**Гула пчолка, гула**

Гула пчолка, гула,
Па бору лятаючы,
Салодкі мёд збіраючы.
А плакала ўдовачка,
Дробных дзетак гадуючы,
Горкі абед гатуючы:
– Дзеткі мае маленькія –
Слёзкі мае драбненькія.
Дзеткі мае пабольшаюць –
Слёзкі мае пагоршаюць.

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

**А я ў полі жыта жала**

А я ў полі жыта жала,
А ў мяне дома бяда стала:
Свякроў з тыну звалілася,
Аб крапіву забілася.
Не жаль жа мне свякровачкі,
А жаль жа мне крапівачкі.
Я крапівачку на нівачку,
А свякровачку ў магілачку.
Я крапіўку паліваць буду,
А свякроўку забываць буду.

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Обадавай Л.С., 69 г.

Репозиторий ВГУ

### Стаяў казёл на гарэ

Стаяў казёл на гарэ,
Дзіваваўся барадзе.
Дзіва, дзіва!
Чыя ж гэта барада
Уся дзёгцем уліта?
Дзіва, дзіва!
Уся дзёгцем уліта,
Саломаю ўвіта.
Дзіва, дзіва!
А ты, гаспадынька, не ляжы,
Бароданьку абліжы.
Дзіва, дзіва!

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Гулаковай Н.М., 73 г.

### Заглянула маё вочка

Заглянула маё вочка,
Што краёчак недалёчка,
А дай, Божа, нам дажацца
Ды гарэлачкі набрацца.

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

## *Талочныя песні*

Талака – від старажытнай калектыўнай узаемадапамогі. У залежнасці ад пары года і характару калектыўнай працы мелі месца тры разнавіднасці талакі: веснавая – на вываз гною, летняя – у час касавіцы і жніва, асенняя – на апрацоўку лёну, сяўбу азімых, малацьбу. Талаку маглі склікаць на нарыхтоўку лесу, будаўніцтва хаты і г.д. Спяваліся талочныя песні звычайна ў час застолля. Амаль усе яны вызначаюцца гумарыстычна-жартаўлівым настроем. Песнямі талачане расказвалі пра тое, якую вялікую работу яны выканалі, як ім было цяжка, заклікалі гаспадара не скупіцца, прасілі часцей гарэлачку наліваць, гаспадыню – смачней частаваць.

### У нас сёння талака

У нас сёння талака,
Шчука рыбу валакла,
А на двары дый не рана.

Репозиторий ВГУ

Талочнікі не пяюць,
Ім гасцінец не даюць,
А на двары дый не рана.

Вы гасцінцы дайце,
Песні вымагайце,
А на двары дый не рана.

У нашага гаспадара
Кудравая галава,
А на двары дый не рана.

Ён кудрамі патрасе,
Нам гасцінец прынясе,
А на двары дый не рана.

Гаспадыня-вутка,
Варочайся хутка,
А на двары дый не рана.

А стаў кашу на стол,
А гаршчок пад стол,
А на двары дый не рана.
Зап. Рубіс Д. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

**Хазяечка-цяцерачка**

– Хазяечка-цяцерачка,
Ці гатова вячэрачка?
– Ай, гатова рыбка з перцам,
Хазяечка з мілым сэрцам.
Зап. Мартынава А. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леднік Н.А., 71 г.

# Сямейна – абрадавая паэзія

Сямейна-абрадавая паэзія – від беларускай вусна-паэтычнай творчасці. Яна суправаджала абрады, звязаныя з найважнейшымі падзеямі ў жыцці кожнага чалавека: нараджэннем, шлюбам, смерцю. Як і абрады, яна мела мэту абараніць ад усяго злога і шкоднага, забяспечыць шчаслівае жыццё.

Репозиторий ВГУ

# *Хрэсьбінныя песні*

Хрэсьбінныя песні – жанр сямейна-абрадавага фальклору. Спяваліся ў час сямейнага святкавання хрэсьбін. Найбольш даўнія радзінныя песні захавалі сляды магічнага светапогляду эпохі першабытнаабшчыннага ладу, імкнення сілай слова абараніць дзіця ад “злых сіл” і забяспечыць яго шчаслівую долю. У іх па-мастацку адлюстраваліся светапогляд, глыбокая народная філасофія, пачуцці, духоўна-жыццёвы вопыт народа; яны асабліва цесна звязаны з вясковым побытам. Радзінныя песні належаць да спецыфічных з’яў беларускага фальклору. Шырока вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва на Віцебшчыне і Магілёўшчыне. Большасць радзінных песень групуецца вакол найважнейшых удзельнікаў сямейнай урачыстасці. Паводле зместу і прызначэння радзінныя песні падзяляюцца на песні-велічанні да парадзіхі і бацькі, песні-зычэнні да дзіцяці, песні апавядальнага характару пра бабку, песні-велічанні і жартоўныя песні да бабкі і кумоў.

**А ў каго, у каго**

– А ў каго, у каго
Мілы кум на куце,
А ў каго, у каго
Зелен сад на дварэ?
– У нашага Ванечкі
Мілы кум на куце.
– А я б такога кума
І за кума не браў:
Сам не есць, не п’ець
І нам не даець.

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

**Бабка к унучцы бараздзёнкай ішла**

Бабка к унучцы
Бараздзёнкай ішла.*
Бабка к унучцы
Парасёнка нясла.
– А на табе, унучка,
Парасёнка майго.
Пакрані, унучка,
Жываточка свайго.

*Кожны другі радок паўтараецца 2 разы.

Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Гулаковай Н.М., 73 г.

Репозиторий ВГУ

## Ой, кума, ты кума

– Ой, кума, ты кума,
Прынясу я жыта.
– Ой, не ідзі, не нясі,
А то буду біта.
– Ой, кума, ты кума,
Прынясу я грэчкі.
– Ой, не йдзі, не нясі,
Не было каб спрэчкі.
– Ой, кума, ты кума,
Прынясу я сала.
– Ой, прыйдзі, прынясі,
Я ўсё яго ждала.
– Ой, кума, ты кума,
Прынясу смятаны.
– Ой, прыйдзі, прынясі,
Мілы мой, каханы.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

## Ой, кумка мая

– Ой, кумка мая,
Прынясу я жыта.
– Ой, не йдзі, не нясі,
А то буду біта.
– Ой, кумка мая,
Прынясу пшаніцы.
– Ой, не йдзі, не нясі:
Убачаць маладзіцы.
– Ой, кумка мая,
Прынясу я рыбы.
– Ой, не йдзі, не нясі,
Бо павыб’юць шыбы.
– Ой, кумка мая,
Прынясу я грошы.
– Ой, прыйдзі, прынясі,
Мілы мой, харошы.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

Репозиторий ВГУ

### А кум кумку

А кум кумку
Пасадзіў у сумку
І аднёс у лясочак,
І сарваў цвяточак.
Мая кумка – душа,
Ва ўсім кумка хараша.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в. Раманава Гарадоцкага раёна ад Воранавай А., 62 г.

## *Вясельныя песні*

Пра беларускае вяселле Р.Р.Шырма піша: “Вяселле – самы ўрачысты абрад у жыцці беларускага народа. Гэта своеасаблівая народная опера з пралогам, драматычнай кульмінацыяй і заўсёды шчаслівым заканчэннем. Народ стагоддзямі дасканаліў, калі можна так назваць, лібрэта гэтае оперы, якая надзвычай багата насычана спевамі, музыкай, танцамі, вострым дыялогам, гумарам”.

Вясельныя песні можна падзяліць на жанрава-тэматычныя групы: апавядальныя, імператыўныя, заклінальныя, лірыка-драматычныя, велічальныя, дакаральныя; яны апавядаюць пра тугу маладой, выкліканую хуткай разлукай з роднай сям’ёй, домам; асуджаюць шлюб, у аснове якога была воля бацькоў, а не каханне; паэтычна праслаўляюць маладых, іх бацькоў; незласліва кпяць са сватоў, жаніха і яго дружыны, прыданак, дружак. Вялікім пачуццём вызначаліся песні, якія спяваліся нявесце-сіраце. Своеасаблівымі ў вясельнай паэзіі былі каравайныя песні і песні стаўбавога абраду. Песні вяселля вызначаюцца выключным багаццем мастацкіх вобразаў і паэтычнай мовай: у іх шырока выкарыстоўваюцца перыфраз, метафара, сімволіка, паралелізм; яны пранізаны матывамі ідэалізацыі.

### Сваты ў хату лезуць

Сваты ў хату лезуць,
А ў печ паглядаюць:
А ці густа капуста,
А ці вялік гаршок кашы,
Ці пад'ядуць кашы
Госцейкі нашы?
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.



Репозиторий ВГУ

**Васіль, Васілёчак да цёшчы на двор**

Васіль, Васілёчак да цёшчы на двор*
Вярбіначкай ціхенька коціцца,
А ў хату - пахучаю мятаю,
А ў сені - сінім васілёчкам сцелецца,
За столікам – саколікам верціцца,
Каля Анечкі – добрым моладцам садзіцца.

* Кожны радок песні паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Кароль-каралевіч Ванечка**

Кароль-каралевіч Ванечка,*
Ай, красіў-прыгож Ванечка.
Ці не сонца яго нарадзіла,
Ці не месяц яго гадаваў,
Ці не зоры яго дзяржалі,
Ці не ветры яго калыхалі?
– Няпраўда твая, Анечка:
Радзіла яго – матухна,
Гадаваў яго – бацюхна,
Дзяржалі яго – сястрыцы,
Калыхалі яго – брацейкі.
Яны яго люлечку калыхалі,
Яго вяселлейка дажыдалі.

* Кожны радок песні паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Чырвон мак, чырвон мак у гародзе**

Чырвон мак, чырвон мак у гародзе,*
Ай, прыгож Васілька на народзе.
П’ець віно, п’ець віно, гарэлачку п’ець,
Манечку-паненачку ён бярэць.

* Кожны радок песні паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

Репозиторий ВГУ

**Звіўся рой не парой**

Звіўся рой не парой,*
Паляцець ён хочыць.
Сабраўся Ванечка,
Дарожкай ехаць хочыць.
А ў тую дарожку таптаную,
Пад сваю Манечку каханую.

* Кожны радок песні паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Ляцелі гусачкі цераз сад**

Ляцелі гусачкі цераз сад,*
Гукнулі Марусеньку на пасад:
– А мне, гусачкі, не да таго,
Ёсць у мяне татулечка для таго:
Пасцеліць каўры,
Благаславіць сесці
На залатым крэслічку,
На шчаслівым месцечку.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Обадавай Л.С., 69 г.

**Стукнула, грукнула на дварэ**

Стукнула, грукнула на дварэ.*
– Ай, глянь, маманька,
Ці не па мне?
Скажы, маманька, дома нет,
Што за сінім морам
Яна жывець,
Пранікам плацце пярэць.

*Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Обадавай Л.С., 69 г.

**Дадому, сваточкі, дадому**

Дадому, сваточкі, дадому:*
Паелі конікі салому,



Репозиторий ВГУ

І ўсю аржаную прамую,
І тую ячную смачную.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Обадавай Л.С., 69 г.

**Баярачкі, спадманачкі вы мае**

Баярачкі, спадманачкі вы мае,*
Казалі, у сад пойдзем гуляць,
Казалі, вянкі будзем звіваць.
Сабе звілі з ружы, з мяты,
А мне звілі з елянца,
З калючага елянца.
Галоўку коліць, Божа ж мой!
Да долу клоніць, Божа ж мой!
Яленец шчыпле, Божа ж мой,
Слёзы сыпле, Божа ж мой!

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

**Не мамка была – мачыха**

Не мамка была – мачыха:
Аддала дачушку скрозь ночку.
І праваднічка не дала,
І лучыначку не дала,
А па самы ж двор – чорны бор,
А па ваконне – сасонне,
А па вуліцы – лазіцы,
Няма дзе папіць вадзіцы.
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

**Я ні разу ў сватах не была, не была**

Я ні разу ў сватах не была, не была,*
Гарэлачкі з мёдам не піла, не піла.
А цяпер у сватах пабуду, пабуду,
Гарэлачкі з мёдам нап’юся, нап’юся.
Наліюць чарачку – я вып’ю, я вып’ю,
Наліюць другую – я й тую, я й тую,



Репозиторий ВГУ

Наліюць трэцюю – я й пайду, я й пайду,
Наліюць чацвёртую – жыць буду, жыць буду!

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

**Усю дарожку конік рысаваў**

Усю дарожку конік рысаваў,*
Пад крутую гару шчыра ўзяў,
Залатыя клешчы паламаў,
Шоўкавы гужы папарваў.
Белае серабро везучы,
Па чыстае золата едучы.
Белае серабро - Мішачка,
А чыстае золата - Анечка.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Пальмінка Гарадоцкага раёна ад Ласкай Б.А., 74 г.

**На вяселле мяне пазвалі**

На вяселле мяне пазвалі,
Чаркі гарэлкі не далі.
Каб жа я знала, не пайшла б,
Ці ж я работкі не знайшла б ?
У запечку лепш сядзела
Ды кудзельку вярцела.
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

**Ездзіла Ганначка на рынак**

Ездзіла Ганначка на рынак,*
За ёй дзевачкі на рынак.
– Прадай, Ганначка, каліну,
Прадай, любая, маліну.
– Не прадам я вам каліну,
Аддам Ванечку маліну.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.



Репозиторий ВГУ

## У нядельку раненька

У нядельку раненька, раненька*
Анечка мамульцы сон кажыць:
– Бачыла я, мамулька, дзіўны сон:
Прыляцеў сокал к нам на двор,
На вароцікі сеў дый запеў,
На вароцікі крылле распусціў,
Па двары пер’ейка рассыпаў.
– Не саколік ляцеў – Мішачка,
Не на варотах сеў – за сталом,
Не крылле распусціў – косачкі,
Не пер'е рассыпаў – слёзачкі.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

## У нашага свата кругом хаты мята

У нашага свата
Кругом хаты мята,
Кругом хаты мята,
А ў хаце – багата.
Кругом хаты – елле.
А ў хаце – вяселле.
З пірагоў печка збіта,
Блінамі накрыта.
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

## Бяленькі, кудравенькі Мішачка

– Бяленькі, кудравенькі Мішачка.*
Хто яму бела лічанька ўмываў,
Хто яму русы кудзеркі ўчасаў,
Хто яму варанога каня асядлаў,
Хто яго ў доўгую дарогу благаслаўляў?
– Умывала бела лічанька мамулька,
Учасала белы кудзеркі сяструлька,
Асядлаў варанога каня братулька,
Бласлаўляў у доўгую дарогу татулька.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.



Репозиторий ВГУ

## Цераз рэчаньку, цераз быструю

Цераз рэчаньку, цераз быструю*
Гібка кладачка ляжыць,
Па той кладачцы, па той гібенькай
Молад Ванечка ідзець,
Сваю Ніначку, сваю душачку,
Ён за ручаньку вядзець.
– А ты, кладачка, а ты гібкая,
Не гніся ты пада мной,
А ты, Ніначка, маладзенькая,
Не старайся ты за мной.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы
Зап. Стахавец І. і вучні Пальмінскай школы ў 1995 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

## Татульку родненькі, не забывай мяне

Татульку родненькі, не забывай мяне,*
У суботку раненька прыязджай ка мне.
Сцежачкі коскамі падмятаць буду,
Дарожку слёзкамі паліваць буду,
Татульку роднага ажыдаць буду.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Салодкай К.І., 82 г.

## Хадзіла Анечка па саду

Хадзіла Анечка па саду,*
Ламала каліну ў палу.
А за ёю мальчыкі хадзілі
І ў яе каліны прасілі.
– Нікаму каліны не дам:
Панясу каліну дадому,
Ды ў Ванечкіну камору,
Палажу каліну на падушкі.
Тут табе, каліна, зіму зімаваці,
А мне, маладой, век векаваці.
Тут табе, каліна, распускацца,
А мне, маладой, разжывацца.
Тут тваім, каліна, кветкам быць,
А мне, маладой, з дзеткамі жыць.

Репозиторий ВГУ

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Няпраўдзівая каліна казала**

Няпраўдзівая каліна казала:*
– Цвісці не буду,
Зялёнага лісточка не пушчу,
Красную ягаду не ўзрашчу.
Як прыйшла вясна,
Зялёныя лісточкі распусціла,
Красную ягаду ўзрасціла.
Няпраўдзівая Аксана казала:
– Замуж не пайду,
Маладога Ванечку не палюблю.
Як прыйшлі сваты, так пайшла,
Маладога Ванечку палюбіла,
На слядок яго ўступіла.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Каціласся кола з-за мор'я**

Каціласся кола з мор'я,*
Прасілася Аксана з застолля
Паглядзець таткіна падвор'е,
Папытаць мамкіна здароўя.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Хвалілася калінка за ракой**

Хвалілася калінка за ракой:*
– Ніхто ж мяне не абламае за вадой.
Пахваліўся люты мароз маладой:
– А я ж цябе, калінінка, змаражу вадой,
Усё суччайка, усё лісцейка паабаб'ю.
Хвалілася Аксаначка сваёй маманькі:
– Ніхто мяне не выманіць з роднай хатанькі.
Пахваліўся любы Коленька маладой:
– А я ж цябе, Аксаначка, прыручу,



Репозиторий ВГУ

Таткіну волю, мамкіну негу выганю.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Не ярка гарыць лучына**

Не ярка гарыць лучына,*
Не жалка плачыць Мар’яна,
Не разжаліла нікога.
– А калі захачу – разжалю,
Выплету ўкосы з русых кос,
Павешаю ўплёты ў клеці.
Мамухна ў клець пойдзець – паглядзіць,
А з клеці ідучы, заплачыць:
– Тут мая дачушка гуляла,
Усё маё падвор’е красіла,
Усю маю сялібу весяліла.
Прыдвор’е красіла краскаю,
Весяліла сямейку ласкаю.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Ой, жаль, мамачка, мне цябе**

Ой, жаль, мамачка, мне цябе:*
Застаецца рута-мятанька ўся табе.
Уставай жа, мая маманька, раненька,
Палівай жа руту-мятаньку часценька.
То ранняй, то вячэрняю зарою,
А найчасцей – гарачаю слязою.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Танюшачка ў мамкі нежна бывала**

Танюшачка ў мамкі нежна бывала,*
На печы пад коўдрай лежнем ляжала,
Не чула пеўнікаў ні разу,
Не бачыла заранькі ў вочы.
А ў свякроўкі яна пабыла,



Репозиторий ВГУ

Пачула пеўнікаў, сені метучы,
Убачыла зораньку, за вадой ідучы.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Кальнула мамкі ў пяткі**

Кальнула мамкі ў пяткі,*
Што некаму падмесці хаткі.
Кальнула бацьку ў грудзі,
Што аддае дачку ў людзі.
А брат воўкам вые,
Што сам міскі мые.
А сястра галосіць,
Што сама ваду носіць.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Звонкае дзерава каліна**

Звонкае дзерава каліна*
На пні стаяла – шумела,
А з пня ляцела – звінела.
Ціхае дзіцятка Аленка
Па полю ехала – маўчала,
На двор уз’ехала – гаварыць стала:
– Тут мая кварцірка распісана,
Тут мая вячэра згатавана,
Тут у мяне пасцелька паслана.
Кварціру распісаў Коленька,
Вячэру зварыла свякроўка,
Пасцельку паслала залоўка.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Досыць частаваць**

Досыць частаваць,
Пусціце гуляць;
Бацінкі скрыпяць,



Репозиторий ВГУ

Хочуць пагуляць;
Чулкі шчакочуць,
Гуляці хочуць.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Ай, пара, пара**

Ай, пара, пара
Сватам да двара.
Ім яшчэ не пара:
Ёсць бочка віна.
Будуць начаваць,
Бочку пачынаць.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**А я ў свата ні разу не была**

А я ў свата ні разу не была,*
Гарэлкі з мёдам не піла.
Сяду на куце, надмуся,
Гарэлкі з мёдам нап’юся.

*Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 гадоў.

**А ўзяло наша, узяло**

А ўзяло наша, узяло,*
Аж да самага Полацка давяло.
Як пайшла слава да Аршавы,
Што наша Людачка звянчана,
А за што, за што – за грошы,
Што яе Коленька харошы.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Просім цябе, Коленька, пакорна**

Просім цябе, Коленька, пакорна,*
Каб было Танюшы жыць спакойна,
Каб не стаяла пад акном,



Репозиторий ВГУ

Не цёрла слёзанькі рукавом.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Ці не Бог табе даў, Ванечка**

– Ці не Бог табе даў, Ванечка,*
Што твая Анечка так хараша?
– Не, не Бог мне даў,
Сам яе ўзяў.
Цёмную ночаньку не дасыпаў,
З варанога коніка не злязаў,
Пакуль Анечку да сябе ўзяў.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Ай, нету нам, нету**

Ай, нету нам, нету*
Ад свата прывету,
Ад свацці дагляду.
Палажылі ложкі,
А хлеба ні крошкі,
Паставілі міскі,
А самі не блізка,
Палажылі хлеба –
Гарэлачкі трэба.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**А сват свата просіць**

А сват свата просіць,*
На руках шапку носіць.
– А свата мой, свата,
Загляні ў маю хату,
Павідай майго дзіва,
Ды папей майго піва.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.



Репозиторий ВГУ

Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**А ў нашага свата**

А ў нашага свата*
Багатая хата:
З пірагоў печка збіта,
Блінамі пакрыта.
Кругом хаты елле,
А ў хаце вяселле.
Кругом хаты рожа,
А ў хаце прыгожа.
Кругом хаты мята,
А ў хаце багата.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І, 76 г.

**Кракнула вутка на беражку сідзя**

Кракнула вутка на беражку сідзя:*
– О Божа ж мой, Божа,
А што ж са мной сталася –
З маладымі вуткамі рассталася,
Селязню міламу дасталася.
Заплакала Аня, за столікам сідзя:
– О Божа ж мой, Божа,
А што ж са мной сталася –
З сяброўкамі рассталася,
Ванечку дасталася.

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Шаўцовай Л.М., 56 г.

Репозиторий ВГУ

# Легенды і паданні

Легенда – эпічнае маласюжэтнае фантастычнае апавяданне гісторыка-гераічнага, міфалагічнага ці апакрыфічнага зместу з абавязковай установкай на выдумку, якую выдаюць за рэальнасць.

Паданне – вуснае празаічнае апавяданне, у якім расказваецца пра сапраўдныя падзеі далёкага мінулага, пра рэальных асоб, якія бралі ў іх удзел. У аснову іх зместу пакладзены рэальныя факты, якія пры перадачы ад аднаго пакалення да другога набываюць паэтычную інтэрпрэтацыю. Паданні з'яўляюцца паэтычнай гісторыяй роднага краю.

## Святая крынічка

Недалёчка ад вёскі Сюбараўка ў лесе, пад вярбою, на самым ускрайку дарогі, выбягае з зямлі халодная крынічка. Яе сталі называць святой пасля таго, як аднойчы святар, які ішоў па дарозе, згубіў на гэтым месцы крыж. Доўга шукаў яго, але ж не знайшоў. Крыж жа праваліўся ў зямлю і пацякла крынічка. Любяць людзі прыходзіць да яе.

Зап. Самсонаў Ю. і Злотнікава М. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачовай Н.У., 59 г.

## Кабішча

На тым месцы, дзе стаіць наша прыгожая вёска, як кажуць старыя людзі і мая прабабка гаварыла мне пра гэта, многа-многа год таму назад было капішча, да якога доўгія гады хадзілі людзі. Яны пасяліліся тут побліз і назвалі вёску Кабішча**.**

Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачовай Н.У., 59 г.

## Цёплы лес

Лясок, які вы бачыце каля вёскі Бароўцы, што праз дарогу, пачалі называць з пасляваеннага часу Цёплым.

Калі прыйшлі фашысты, у ім знайшлі прытулак жыхары вёсак Кабішча, Бароўцы і іншых. І ён усіх схаваў ад ворагаў, прытуліў, накарміў, абагрэў. І як яго іначай назавеш?

Мы з удзячнасцю прыходзім у гэты лес, ён і сёння для нас цёплы.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачовай Н.У., 59 г.

Рэпазіторый ВГУ

## Вёска Шпакі

Так назвалі нашу вёску пасля таго, як на сялянскія палеткі наваліліся невядомыя вусені. Голад чакаў людзей, але шпакі знішчылі вусеняў і выратавалі ўраджай. Удзячныя людзі і назвалі вёску Шпакі.

Зап. Злотнікава М. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Рыбаковай І.У., 46 г.

## Вёска Шпакава

Па дарозе на Евіна ўздоўж дарогі калісьці была вёска Бярэзнік. Шанавалі жыхары яе веснавых шпакоў. Любілі сяліцца тут гэтыя птушкі. І людзі памянялі назву вёскі. Гэта сягоння Шпакава.

Зап. Злотнікава М. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Рыбаковай І.У., 46 г.

## Вёска Пальмінка

Колісь даўно ў нашай вёсцы жыў багаты пан. Гэта пры ім выкапалі глыбокую сажалку і абсадзілі яе ліпамі. Была ў яго прыгажуня дачка. Вельмі любіў пан вандраваць і аднойчы ў паўднёвай краіне ўбачыў ён пальму незвычайнай прыгажосці. Пан глянуў на дачку і сказаў: “Як ты падобна на гэту пальмінку!” І з таго часу ўсе пачалі называць яе Пальмінкай. Аднойчы перад Калядамі узышла дзяўчына на тонкі лёд пруда і правалілася. Колькі ні шукалі дзяўчыну, але знайсці так і не змаглі. Маці з вялікага гора абярнулася вярбой і апусціла рукі-голле ў ваду. І да нашага часу імкнецца дастаць, выратаваць дачушку, любую Пальмінку.

Кажуць, адзін раз у год яны ажываюць, сустракаюцца і пра штосьці гавораць цэлую ноч пад ліпамі на беразе сажалкі. Але іх ніхто ніколі не бачыў і не падслухаў іх размову. Многія хацелі б сустрэцца з імі.

З тых далёкіх часоў усіх прыгожых дзяўчат нашай вёскі называюць Пальмінкамі.

Так называюць і вёску.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Прышчэпавай Н.У., 59 г.

## Лілеі для каханай

У бярэзніку за рэчкай Кабішчанкай было зарослае аерам возера. Аднойчы прыйшоў да яго юнак, пачаў на лодцы рваць лілеі для сваёй каханай. Але ж лодка перакулілася. І патануў хлопец, а на тым месцы зараз расце мох і журавіны.



Рэпозиторий ВГУ

Зап. Самсонаў Ю., Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Багданавай Л.Я., 70 г.

# Лірычныя песні

Лірычныя песні не звязаны з абрадамі і календаром. Іх спяваюць за працай, пры адпачынку, у радасці і ў горы. Яны раскрываюць духоўны свет чалавека, яго эстэтычныя ідэалы. Паводле тэматыкі падзяляюцца на любоўныя, сямейна-бытавыя, аб роднай старонцы, гістарычныя, жартоўныя, песні-балады, гульнёвыя, дзіцячыя, танцавальныя і інш. Лірычныя песні – сапраўдная мастацкая энцыклапедыя народа; глыбока паэтычныя, шчырыя, яны з’яўляюцца выяўленнем душэўнай сілы, энергіі, народнага аптымізму, які ўмацоўвае веру ў светлую будучыню.

**Як я молада ў матулькі была**

Як я, молада, у матулькі была,
Як вішанька, у садочку цвіла.
Ой, калі калінка цвіла,
У саду ягада маліна была,
А як троху я састарылася,
Я нікому не наравілася.
Аднаму мужычку-дурачку,
Што ў карчомцы распіваецца,
А як прыйдзе дамоў – са мной лаецца.
Загадаець разуваць, раздзяваць,
Загадаець бел пасцельку паслаць,
А мне, моладзе, ня хочацца
Каля п’янага варочацца:
Белы ручкі памараюцца,
Златы кольцы пасціраюцца.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Салодкай К.І., 82 г.

**А ў цёмным лесе сава кугічыць**

А ў цёмным лесе сава кугічыць,
А ў чыстым полі муж жонку клічыць,
Люлі, люлі, жонку клічыць.
А ў цёмным лесе сава кугічыць,
Рана, рана муж жонку клічыць,
Люлі, люлі, жонку клічыць.
– Ты, жонка Ганна, хлапцам падмана,
Хоць мужа маеш – усім маргаеш,



Репозиторий ВГУ

Люлі, люлі, усім маргаеш.
– Ці ж, мой міленькі, я таму вінна,
Што за мной хлопцы,
Як за дзяўчынай,
Люлі, люлі, як за дзяўчынай.
– Ай, жонка, жонка, досыць ілгаці,
Бо я прымушу праўду сказаці,
Люлі, люлі, праўду сказаці.
– Калі, міленькі, ты мне не верыш,
Павесь мне званочак пад падалочак,
Люлі, люлі, пад падалочак.
Як хто затроніць – званок зазвоніць,
А ты пачуеш, мяне ўратуеш,
Люлі, люлі, мяне ўратуеш.
Званочак зазваніў у садзе, ля хаты,
А муж не чуе, бо глухаваты,
Люлі, люлі, бо глухаваты.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

**Ад панядзелка да панядзелка**

Ад панядзелка да панядзелка
Смачна п’ецца нам гарэлка.
Як прадам жыта ворак,
Яшчэ вып’ем і ў аўторак.
Як прадама скавараду,
Яшчэ вып’ем і ў сераду.
Як прадама ўвесь ячмень,
Яшчэ вып’ем і ў чацвер.
Як прадам жонкі спадніцу,
Вып’ем яшчэ і ў пятніцу.
Як закончым усю работу,
Яшчэ вып’ем у суботу.
Як прадам яшчэ кудзелю,
Яшчэ вып’ем і ў нядзелю.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

**Расцвіла каліна, белы цвет**

Расцвіла каліна, белы цвет, (2 р.)
Мужа займела,
Займела я мужа,
Займела я мужа п’яніцу.



Репозиторий ВГУ

Нічога не робіць, толькі п’е, (2р.)
Прыйдзе дадому,
Дадому прыйдзе,
Дадому прыйдзе – жонку б’е.
– Не бі мяне, мужа, не карай, (2 р.)
Бо цябе пакіну
І дзяцей пакіну,
А сама паеду за Дунай.
Калі я на лодку сядала, (2 р.)
Праваю ручанькай,
Белаю хустанькай,
Белаю хустанькай махала.
– Ой, вярніся, жонка, дадому: (2 р.)
Нашы дзеці плачуць,
Яны есці хочуць,
Ой жа, як мне цяжка аднаму.
Як вярнулася жонка дадому, (2 р.)
Лыжкі нямыты,
Чашкі пабіты,
А дзеці ўсе плачуць на пячы.
Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

**А хто скажа, што мой муж добры**

А хто скажа, што мой муж добры,
Няхай таму будзе век доўгі.
Ён прыйдзе, ды напіўшыся,
А я прыйду, нарабіўшыся.
А я яму пасцель белу пасцялю,
А ён мяне кіем па баку.
А я яму кашу з малаком,
А ён мяне па баку кулаком.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

**Абяцаў мешчанін**

Абяцаў мешчанін
Мяшчаначку ўзяці.
Яна ж ў панядзелак сказала,
Што не ўмее жаці.
Будзе твая пшанічанька
Ў полі зімаваці.
А ва ўторак снапоў сорак

Репозиторий ВГУ

Пшаніцы нажала,
А ў сераду насушыла,
А ў чацвер змалаціла,
А ў пятніцу веяла,
А ў суботу мерыла,
А ў нядзелю прадала,
Усе грошы прапіла.
Як піла гарэлачку,
Так і піць буду,
Як біла свайго мужа,
Так і біць буду,
Рукі засучыўшы,
К стаўбу прывязаўшы.
А ён мяне папрасіў,
Шапачку зняўшы:
– Жана мая міла,
За што мяне біла?
– Я за тое цябе біла,
Каб гарэлачку не піў,
Чужых жонак не любіў,
Табакі не нюхаў,
Адну мяне слухаў.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ліцвінавай К.І., 76 г.

**Сіза паванька**

Ай, лятала сіза паванька
У зялёным саду.
І раняла сізы пёрушкі
Ў шоўкаву траву. (2 р.)

Мне не жалка сізы пёрушкі
Ў шоўкавай траве,
А мне жалка сястрычушкі
Ў чужой старане. (2 р.)

Сядзіць яна пад акошачкам,
Як розавы цвет.
Раняе яна слязіначкі,
Што радзінкі нет. (2 р.)

Падуй, павей, вецер,
У роднай старане.
Прыдуй, прывей, буен вецер,



Репозиторий ВГУ

Родну сястрыцу ка мне. (2 р.)

Ай, лятала сіза паванька
У зялёным саду
І раняла сізы пёрушкі
Ў шоўкаву траву. (2 р.)
Зап. Рубіс Д. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

**Каціласея бочачка дубовая**

Каціласея бочачка дубовая,
А ў ёй ды гарэлачка мядовая,
А ў ёй ды гарэлачка мядовая.
Гарэлачку б выпіла малодая,
Яна б яе выпіла без атвету,
Ды майго міленькага дома нету.
Паехаў мой міленькі ў Гарадочак,
А я, маладзюсенька, у садочак.
Вішаньку за вяршочак гнула, гнула,
Гнула, гнула, не абагнула,
Лягла я пад вішаньку і заснула.
Прыехаў мой міленькі – я не чула.
– Устань, устань, мілая,
Любая, прачніся.
На маю калясачку падзівіся.
А мая калясачка не прастая,
Сядзем і паедзем, дарагая.
Зап. Рубіс Д. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

**А ў Марусі хата на памосце**

А ў Марусі хата на памосце,
Хата на памосце.
Прыехалі тры казакі ў госці,
Тры казакі ў госці.
Ой, не тое зеллейка дастала,
Не тое дастала.
Першы кажа: "Я Марусю люблю,
Марусю люблю".
Другі кажа: "Я Марусю вазьму,
Марусю вазьму".
Трэці кажа: "Зеллейка дастану,
Зеллейка дастану,

Як з Марусяй на ручніку стану,
На ручніку стану".
Ёсць у мяне тры кані на стайні,
Тры кані на стайні.
Адзін конік, як лебедзь, бяленькі,
Лебедзь бяленькі.
Другі конік, як голуб, сівенькі,
Як голуб сівенькі.
Трэці конік, як воран, чарненькі,
Як воран чарненькі.
Белым конем поле пераеду,
Поле пераеду.
Сізым конем у Гарадок паеду,
У Гарадок паеду.
Чорным конем зеллейка дастану,
Зеллейка дастану,
І з Марусяй на ручнік стану,
На ручнік стану.
Ой, стаў Яся зеллейка капаць,
Зеллейка капаць.
Стала яна ў ім дзіцятку купаць,
Дзіцятку купаць.
Пойдзе Яся зеллейка капаці,
Зеллейка капаці,
А ў  Марусі вяселлейка ў хаце,
Вяселлейка ў хаце,
А ў Марусі хата на памосце,
На памосце,
Прыехалі да Марусі на вяселле госці,
На вяселле госці.
Зап. Рубіс Д. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

**Узлавалася жонка на мужа**

Узлавалася жонка на мужа,
Узлезла на печку –
Уставаць не буду.
– Уставай  ты, жонка,
Прынёс табе мёду.
– Не хачу я мёду,
Не ем яго зроду.
– Уставай ты, жонка,
Я прынёс гарэлкі.
– Не хачу гарэлкі,


Репозиторий ВГУ

Шукай сабе дзеўкі.
– Уставай ты, жонка,
Я прынёс дубінку,
Я прынёс дубінку
Ды на тваю спінку.
А мілая ўстала,
Як і не ляжала,
Абняла мілога
І пацалавала.
– Дзякуй табе, мілы,
Што ты дагадаўся,
На маю хваробу
Лекі расстараўся.
А мне ж не балелі
Ні цела, ні косці,
Гэта я ляжала
З вялікае злосці.
Зап. Рубіс Д. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Каралёвай З.М., 45 г.

**Коля, Коля, твае коні**

Коля, Коля, твае коні
Пад гарой вады не п‘юць.
Коля, Коля, твае вочкі
Мне спакою не даюць.
Я ў Колі ў калідоры
Палічыла лесенкі,
Я пад Коліну гармошку
Падпявала песенькі.
Коля, Коля, твае коні
Патапталі тату рож.
Тата Коленьку ругаіць,
А мне Коленька харош.
Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна ад Шпілёвай Е.Я., 75 г.

**Марусенька, мая даражэнька**

– Марусенька, мая даражэнька,
Раскажы ты мне, харашэнька,
Адкуль у цябе
Былі госці без мяне ?
– Капітан быў із Берліна,
А маёр із Сахаліна,



Репозиторий ВГУ

А салдацік радавой
З Беларусіі радной.
– Марусенька, мая даражэнька,
Раскажы ты мне, харашэнька,
А што ж у цябе
Пілі госці без мяне ?
– Капітан піў руска-горку,
Маёр піў самагонку,
А салдацік радавой
Піў налівачку са мной.
– Марусенька, мая даражэнька,
Раскажы ты мне, харашэнька,
А што ж у цябе елі госці без мяне ?
– Капітан еў парасёнка,
Маёр еў гусянёнка,
А салдацік радавой
Еў курацінку са мной.
– Марусенька, мая даражэнька,
Раскажы ты мне, харашэнька,
А дзе ж у цябе
Спалі госці без мяне ?
– Капітан спаў на дыване,
А маёр спаў на тапчане,
А салдацік радавой
Спаў у горніцы са мной.
Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна ад Шпілёвай Е.Я., 75 г.

**Дзе б я ні ехала, дзе б не ішла**

Дзе б я ні ехала, дзе б ні ішла,
Я ж табе, мама, дзякавала.
Дзякуй, дзякуй табе, мама,
Што будзіла мяне рана. (2 р.)

Дзе б я ні ехала, дзе б ні ішла,
Я ж табе, тата, дзякавала.
Дзякуй, дзякуй табе, тата,
Што вясёла наша хата. (2 р.)

Дзе б я ні ехала, дзе б ні ішла,
Я ж вам, парогі, дзякавала.
Дзякуй, дзякуй вам, парогі,
Што адбілі хлопцам ногі. (2 р.)



Репозиторий ВГУ

Дзе б я ні ехала, дзе б ні ішла,
Я ж вам, вароты, дзякавала.
Дзякуй, дзякуй вам, вароты,
Што прымалі хлопцаў роты. (2 р.)

Дзе б я ні ехала, дзе б ні ішла,
Я ж вам, таполі, дзякавала.
Дзякуй, дзякуй вам, таполі,
Нагулялась я даволі. (2 р.)
Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна ад Шпілёвай Е.Я., 75 г.

**А той цёмны лес сасновы**

А той цёмны лес сасновы
Маркотна шуміць,
А бедна маё сэрца
Так крэпка баліць.

Ой, пайду я ў лес сасновы,
Пачну я гукаць:
– Ой, не маю шчасця, долі –
Буду шукаць.

Хаджу, блуджу я па лесе,
Забіваюся,
Слёзанькамі гарачымі
Абліваюся.

– Ой, ты, доля,мая доля,
Прыйдзі да мяне!
Прыгалуб хоць на дзянёчак
Як дзіцё свае.

Так мне сумна! У свеце цяжка
Жыці сіратой.
Ой, прыйдзі ты, мая доля,
Зжалься нада мной.

І хадзіла я, шукала,
Долі не знайшла,
Мабыць, тая мая доля
Далёка пайшла.

Ой, пайшла яна, не прыйдзе



Репозиторий ВГУ

У куточак мой,
І век цэлы буду жыці
Круглай сіратой.
Зап. Мартынава А. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна ад Шпілёвай Е.Я., 75 г.

# Прыказкі і прымаўкі

Прыказка – гэта найчасцей двухчленнае, рыфмаванае, афарыстычнае, ўстойлівае выслоўе з павучальным зместам, якое носіць абагульнены характар і характарызуецца закончанасцю думкі.

Прымаўка – ўстойлівае народнае выслоўе з незавершанай думкай.

Тэматыка прыказак і прымавак разнастайная: у іх адлюстраваны ўзаемадносіны паміж людзьмі ў грамадстве, светапогляд народа, яго мараль, ідэалы, любоў да Радзімы, нянавісць да ворагаў, поры года і працоўны каляндар, народныя прыкметы, мудрыя парады селяніну, асуджэнне п’янства і курэння і інш. Стварэнню ёмістых вобразаў у іх садзейнічаюць параўнанні, метафары, метанімія, гіпербала, сінекдаха, рытміка і рыфма.

Ад чаго захварэў, тым і лячыцца трэба.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Кабішча ад Дзергачова І.П., 59 г.

* * *

Лёгка п’ецца, ды потым ікнецца: ходзіш хворы і хрукаеш, як бораў.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Кабішча ад Дзергачова І.П., 59 г.

* * *

Хто яе абідзіць, той сцежкі не ўвідзіць.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Кабішча ад Дзергачова І.П., 59 г.

* * *

Сябра пазнаеш у бядзе і калі тонеш у вадзе.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Селіванавай М.А., 74 г.

* * *

Адна пчала многа мёду не наносіць.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *

Братняя любоў крапчэй сцен  каменных.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *

Дзе маці нарадзіла, там і радзіма.



Репозиторий ВГУ

Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.
* * *
Подласць блізкага страшнейшая за кулю.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *
Гатовы кавалак і гультай засмажыць.
Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *
Матка галоўку мые – гладзіць, кашульку дае – здароўя жадае, а мачыха мые – прыскубае, кашулю дае – праклінае.
Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *
Шчасце не салавей: яго у кішэнь не пасадзіш.
Зап. Глябовіч А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *
На благога чалавека і сабака брэша.
Зап. Глябовіч А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *
Любіць котка рыбу, ды лавіць не ўмее.
Зап. Глябовіч А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *
Дзе гультай арэ і скародзіць, там адно пустазелле родзіць.
Зап. Глябовіч А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *
Палахлівец і таракана прымае за велікана.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *
Ён не балван: скончыў дзевяць класаў з братам напапалам.
Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Багданавай Л.Я., 70 г.

* * *
Абяцаная шапка не старэе і вушэй не грэе.
Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *
Багата клумба кветкамі, а хатка – дзеткамі.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

Репозиторий ВГУ

* * *

Даражэй не сняданне, а ласка і прывітанне.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Зімовая ночка – дзеткам сарочка.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Вельмі часта ў Кабішчах у кішэнях вецер свішча.
Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Дзергачова І.П., 59 г.

# Загадкі

Загадка – жанр малой формы, які з дапамогай метафар, увасабленняў, метанімій, алегорый, параўнанняў у форме пытання падае іншасказальнае вобразнае апісанне як празаічнай, так і вершаванай мовай пэўных прадметаў ці з'яў. Тэматыка беларускіх загадак ахоплівае з'явы прыроды, раслінны і жывёльны свет, працоўную дзейнасць, прылады працы, сямейны і грамадскі быт і г.д. З даўніх часоў загадкі развівалі кемлівасць, былі сродкам выяўлення разумовых здольнасцей чалавека. Іх можна сустрэць у іншых жанрах фальклору – у песнях, казках.

Бяжыць – скрыпіць, ляжыць – маўчыць. (Новы бот)
Зап. Баканаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *

Не звер, а лахматая, не конь, а з вушамі. (Шапка)
Зап. Баканаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

* * *

І сваё дзіця не забыла, і чужых малаком напаіла. (Карова)
Зап. Баканаў А. у 2007 г. у в. Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *

Чырвоненькая шапачка, а беленькі пянёк. (Маліна)
Зап. Баканаў А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Ахрамей Н., 16 г.

Рэпазіторый ВГУ

* * *

Сядзіць паненка, на ёй чырвоная сукенка, хто ідзе, кожны ёй паклоніцца. (Суніцы)

Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *

Дай піць – будзе гаварыць. (Пяро і чарніла)

Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Леўчанка Т., 16 г.

* * *

Хто можа хадіць на чатырох, двух і трох нагах? (Чалавек).

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

У лесе жыве, харчуецца, на галаве дрэва красуецца. (Лось).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Хоць б'юць яго, а ён не плача.
Чым б'юць мацней, тым вышай скача. (Мяч).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Не будзільнік, а праспаць гаспадыні ён не дасць. (Певень).

Зап. Ляснічая Н.А. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Крылаў не маю, а хутка лятаю, сам мяне выпусціш, а потым не зловіш. (Слова).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Нітак многа, а ў клубок не зматаеш. (Павуцінне).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

У хаце замярзае, а на дварэ – не. (Аконнае шкло).



Репозиторий ВГУ

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Хутка грызе, дробна жуе, а сама не глытае. (Піла).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Чым больш з яе бярэш, тым большай яна робіцца. (Яма).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Без рук, без ног, без чэрава, а ўзлез на дзерава. (Хмель).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а без валасоў. (Бяроза).

Зап. Ляснічая Н. у 2007 г. у в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

# Прыпеўкі

Прыпеўкі – невялікія аднастрофныя песенькі лірычнага ці гумарыстычна-сатырычнага характару, складзеныя на тыповы напеў. Прыпеўкі могуць быць двух-, чатырох- і шасцірадковыя. Тэматыка прыпевак надзвычай разнастайная, яны хутка адклікаліся на ўсе праявы асабістага жыцця людзей, на змены ў жыцці грамадства. Сваю вобразную сістэму (паралелізм, сімволіку, паўторы, анафары, гіпербалы і інш.) прыпеўкі запазычылі ад традыцыйнай народнай песні.

* * *

А ўсе мальцы папрыбраліс:
Пры касцюмах, пры часах.
А мой чухала прычухала
Ў чырвоных сапагах.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 71 г.

* * *

Не купляй мне, татка, шубу,
У шубе блохі заядуць.
Купі зонцік і галошы,
Далей мальцы павядуць.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 71 г.



Репозиторий ВГУ

* * *

Мой мілёнак разгуляўся –
Многа еў і многа піў
І да дзевак заляцаўся,
Каб камар яго забіў.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 71 г.

* * *

Мяне маменька будзіла,
Па галоўцы гладзіла.
Уставай, уставай, сыночак,
Я катомку зладзіла.

Зап. Злотнікава М. у 2007 г. у в.Шпакі Гарадоцкага раёна ад Шпілёвай Е.Я., 75 г.

* * *

Гарманіст у нас адзін,
Яму цукерачку дадзім.
Праўда, дзеўкі, нада даць –
Весялей будзе іграць.

Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Генадзя Н.Л., 75 г.

* * *

А я малец беларускі
Вып'ю літар без закускі,
А з закускай вып'ю два,
Не баліць і галава.

Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Генадзя Н.Л., 75 г.

* * *

Як у нашай дзеравушкі
Любушка любілася,
Як на пудру яйцы крала,
Аж з гнязда звалілася.

Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Лістраценка Г.Н., 75 г.

* * *

Як учора і заўчора
Лупцаваў мяне ацец.
На работу ты лянівы,
А на гульні – маладзец.



Репозиторий ВГУ

Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Генадзя Н.Л., 75 г.

* * *

Гарманісціка любіць –
Нада чысценька хадзіць,
Чысценька, акуратненька,
Гаварыць прыятненька.
Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Генадзя Н.Л., 75 г.

* * *

На вячорку я збіраўся,
Мама супу наліла,
А з вячорак я вяртаўся –
Падзатыльнікаў дала.
Зап. Злотнікава М. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Багданавай Л.Я., 70 г.

* * *

У калодцы вада льецца,
Вада мутнаватая.
Муж нап’ецца, прыйдзе – б’ецца:
Жонка вінаватая.
Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Балотнікавай Е.А., 74 г.

* * *

Чуць-чуць шавялісь,
Кураняткі каб вялісь,
Пеўнікі радзіліся,
Каб яны любіліся.
Зап. Мартынава А. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Багданавай Л.Я., 70 г.

* * *

Каля лесу дым дыміўся
Па траве ціхонечка,
Па мне міленькі сумуе,
Я па ім – ніколечкі.
Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Пра мяне нагаварылі,
Пра мяне набаілі.



Репозиторий ВГУ

Тры славечкі было праўды,
Трыццаць тры прыбавілі.
Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Калышыся, калышыся,
Ветачка альховая.
Ні ў каго ты не ўлюбляйся,
Мая чарнабровая.
Зап. Шавяка В. у 2007 г. у в.Сюбараўка Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Ой, салома, ты салома,
Ты салома белая,
Не расказывай нікому,
Што я ў дзеўках дзелала.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Салодкай К.І., 82 г.

* * *

Ой, чарачка, сакатушачка,
Не йдзі ў галаву,
А йдзі ў брушачка.
Не стучы, не хручы,
Мае костачкі душы.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Салодкай К.І., 82 г.

* * *

Пасадзіла пеўня я,
Пасадзіла курыцу,
Дзеда ў люльку палажыла,
А сама на вуліцу.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Шаўцовай Л.М., 56 г.

* * *

А дзядуля бабку
Пасадзіў на градку,
Паліваў яе вадой,
Каб стала бабка маладой.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Шаўцовай Л.М., 56 г.

Репозиторий ВГУ

* * *

– Ой, чаму ў цябе, Кацюша,
Губкі саладзенькія?
– Я намазала іх мёдам
Для цябе, міленькі.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Хартова Гарадоцкага раёна ад Жаголка Н., 59 г.

* * *

Нашы евінскія мальцы
На людзях куражуцца,
Штаны рваныя надзенуць,
Путам перавяжуцца.

Зап. Яскевіч Н. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Рыбаковай І.У., 46 г.

* * *

Як у маці я была,
То як вішанька цвіла,
Як з табою жыць я стала,
То жыццё маё завяла.

Зап. Злотнікава М. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Васільевай Н.Ц., 72 г.

* * *

Эх, яблычка
Ды з цыбулькаю,
Ідзе дзед ваяваць
Ды з бабулькаю.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Я падпіла, падгуляла,
Цяпер мяне знайце,
Чаравічкі я стаптала,
Мне другія дайце.

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Пайду барыню скакаць,
Надзену барэткі.
Буду ногі падымаць
Вышэй табурэткі.



Репозиторий ВГУ

Зап. Емяльянаў А. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Не глядзіце на дзяўчат,
Што ў іх за брошкі.
А вазьміце паглядзіце,
Ці памыты ножкі.

Зап. Яскевіч Н. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Така, така мая доля,
Так я і рабіла.
Свайго мужа шанавала,
А хлопцаў любіла.

Зап. Яскевіч Н. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Заспяваю я прыпеўку,
Заіграю ў ражок.
Дзе знайсці такую дзеўку,
Каб была як піражок.

Зап. Яскевіч Н. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Беларуская валюта
Бульбай называецца.
Наясіся гэтай бульбы –
Весялей спяваецца.

Зап. Шавяка В. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

* * *

Брыгадзір ходзіць па полю,
А брыгада па палях,
Брыгадзір забіў варону,
Раздзяліў па трудаднях.

Зап. Сталярэнка А. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Балотнікавай Е.А., 74 г.



Репозиторий ВГУ

* * *

Перастала я любіць
Я свайго касаціка.
Палячу я на Луну,
Палюблю лунаціка.
Зап. Злотнікава М. у 2007 г. у в.Бароўцы Гарадоцкага раёна ад Багданавай Л.Я., 70 г.

* * *

Самагон, самагон,
Хто цябе не гоне –
І райком, і партком,
І міліцыя тайком.
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Шаўцовай Л.М., 56 г.

* * *

Завялі мяня ў балота,
Як дурак на ім тарчу.
Ох, спасіба за заботу
Дарагому Ільічу!
Зап. Самсонаў Ю. у 2007 г. ў в.Кабішча Гарадоцкага раёна ад Шаўцовай Л.М., 56 г.

* * *

Даражэй майго мілога
Няма хлопца на зямлі.
Я яго даўно купіла
За расійскія рублі.
Зап. Матора В. у 2007 г. ў в.Шпакава Гарадоцкага раёна ад Якімавай В.Н., 70 г.

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

***Прадмова***……………………………………………..………………3
***Паэзія земляробчага календара***……………………………………..4
Калядкі………………………………………………………………………4
Масленічныя песні…………………………………………………………5
Веснавая песні……………………………………………………………8
Валачобныя песні…………………………………………………………...9
Купальскія песні……………………………………………………………10
Жніўныя песні……………………………………………………………12
Талочныя песні……………………………………………………………13
***Сямейна-абрадавая паэзія***…………………………………………14
Хрэсьбінныя песні……………………………………………………..15
Вясельныя песні…………………………………………………………17
***Легенды і паданні***………………………………………………..30
***Лірычныя песні***…………………………………………………..32
***Прыказкі і прымаўкі***……………………………………………..41
***Загадкі***……………………………………………………………43
***Прыпеўкі***…………………………………………………………...45

Репозиторий ВГУ